**ПЕРАЛІК ДАКУМЕНТАЎ**
**для паступаючых на ўмовах мэтавай падрыхтоўкі:**

• заява на імя кіраўніка УВА па ўстаноўленай Міністэрствам адукацыі форме (афармляецца ў лічбавым кабінеце абітурыента і непасрэдна пры падачы дакументаў);

• арыгінал атэстата аб агульнай сярэдняй адукацыі, або арыгіналы дыплома аб прафесійна-тэхнічнай адукацыі і дадатку да яго, або арыгіналы дыплома аб сярэдняй спецыяльнай адукацыі і дадатку да яго, за выключэннем ніжэйзгаданых выпадкаў:

- арыгінал атэстата аб агульнай сярэдняй адукацыі і арыгіналы дыплома аб прафесійна-тэхнічнай адукацыі на аснове агульнай сярэдняй адукацыі і дадатку да яго - для асоб, якія атрымалі прафесійна-тэхнічную адукацыю на аснове агульнай сярэдняй адукацыі;
- арыгінал атэстата аб агульнай сярэдняй адукацыі і арыгіналы дыплома аб сярэдняй спецыяльнай адукацыі на аснове агульнай сярэдняй адукацыі і дадатку да яго – для асоб, якія атрымалі сярэднюю спецыяльную адукацыю на аснове агульнай сярэдняй адукацыі;

• медыцынская даведка аб стане здароўя па форме, якая ўстанаўліваецца Міністэрствам аховы здароўя;

• рэкамендацыя з апошняга месца працы (службы) або педагагічнага савета ўстановы адукацыі, якую скончыў абітурыент, па ўсталяванай форме;

• характарыстыка, выдадзеная ўстановай агульнай сярэдняй адукацыі або ўстановай, якая рэалізуе адукацыйныя праграмы прафесійна-тэхнічнай або сярэдняй спецыяльнай адукацыі, па форме і ў парадку, што ўстанаўліваецца Міністэрствам адукацыі (для асоб, якія атрымалі агульную сярэднюю, прафесійна-тэхнічную адукацыю або сярэднюю спецыяльную адукацыю ў год прыёму ва УВА) па ўстаноўленай форме;

• дагавор аб мэтавай падрыхтоўцы спецыяліста з вышэйшай адукацыяй;

• дакументы, якія пацвярджаюць права абітурыента на льготы пры залічэнні для атрымання агульнай вышэйшай адукацыі;

• фатаздымкі 3*4 - 6 шт.

• дакументы аб выніках праходжання прафесійнага псіхалагічнага адбору (толькі для абітурыентаў, якія ўдзельнічаюць у конкурсе на атрыманне вышэйшай адукацыі на ўмовах мэтавай падрыхтоўкі ў інтарэсах Следчага камітэта)

Дакументы ў прыёмную камісію падаюцца абітурыентамі асабіста або іх прадстаўнікамі.

У выпадку падачы дакументаў абітурыентам дакумент, які пацвярджае асобу, прад'яўляецца ім асабіста.

У выпадку падачы дакументаў ад імя абітурыента яго законным прадстаўніком прад'яўляюцца дакументы, якія пацвярджаюць асобу і статус законнага прадстаўніка, і копія дакумента, якая пацвярджае асобу абітурыента.

У выпадку падачы дакументаў ад імя абітурыента яго прадстаўніком, які дзейнічае на падставе даверанасці, прад'яўляюцца дакумент, які сведчыць асобу прадстаўніка, копія дакумента, якая сведчыць асобу абітурыента, і даверанасць, засведчаная натарыяльна або ўпаўнаважанай службовай асобай.

Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 03.06.2008 № 294 (у рэдакцыі ад 16.03.2021 № 107) "Аб дакументаванні насельніцтва Рэспублікі Беларусь" устаноўлена, што дакументамі, якія сведчаць асобу, з'яўляюцца:

• пашпарт грамадзяніна Рэспублікі Беларусь;

• від на жыхарства ў Рэспубліцы Беларусь;

• пасведчанне бежанца;

• ідэнтыфікацыйная карта грамадзяніна Рэспублікі Беларусь;

• біяметрычны від на жыхарства ў Рэспубліцы Беларусь замежнага грамадзяніна;

• біяметрычны від на жыхарства ў Рэспубліцы Беларусь асобы без грамадзянства.